# ПАЛІТЫЧНАЯ БАРАЦЬБА НА НЕАКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў ПАЧАТКУ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ (1918 г.)

*В.У. Акуневіч*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

1918 г. з'яўляўся апошнім годам Першай сусветнай вайны. У той жа час для Беларусі ён стаў часам разгортвання грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі. Абвастрылася палітычная барацьба сярод былых саюзнікаў, левых сіл, якія намагаліся разгарнуць рэвалюцыю ў 1917 г. Гэты год у многім прадвызначыў будучыню Беларусі.

Мэта даследавання – выявіць асаблівасці палітычнага становішча на Віцебшчыне ў 1918 г., устанавіць сувязь адбываўшыхся падзей з агульнапалітычнымі працэсамі ў тагачаснай Расійскай дзяржаве.

**Матэрыял і метады.** Крыніцамі для напісання працы паслужылі фонды дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. У даследаванні выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя, так і спецыяльна-гістарычныя метады. Гісторыка-генетычны метад вывучэння архіўных матэрыялаў дазволіў прасачыць змены палітычнай сітуацыі і палітычнай барацьбы ў вывучаемым рэгіёне. Гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны метады паспрыялі выяўленню сістэмы з'яў, якія былі характэрны для часу грамадзянскай вайны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У 1918 г. Першая сусветная вайна ўступіла ў свой апошні перыяд. 18 лютага 1918 г. Германія аднавіла ваенныя дзеянні. 10-я армія і 21-ы корпус германскіх войскаў пачалі наступленне на тэрыторыі Беларусі. На пачатку сакавіка 1918 г. Віцебскі, Аршанскі і Магілёўскі рэвалюцыйныя атрады, 2-я рэвалюцыйная армія пад камандаваннем Р. Берзіна затрымалі нямецкае наступленне на лініі Орша – Магілёў – Гомель. Нямецкія войскі спыніліся ў 70-ці вярстах ад г. Віцебска. Паводле ўмоў Брэсцкага міру не акупаванымі заставаліся толькі Віцебскі і Гарадоцкі, часткі Аршанскага, Лепельскага і Сенненскага паветаў. З сакавіка 1918 г. на ахову лініі размежавання паміж нямецкімі войскамі і атрадамі Чырвонай Арміі, так званай загараджальнай "завесы", выступілі Віцебскі, Аршанскі, Смаленскі атрады і іншыя падраздзяленні. Такім чынам г. Віцебск і ўсходняя Віцебшчына сталі прыфрантавой зонай.

Яшчэ напярэдадні наступлення Германскай арміі бальшавікам Віцебска ўдалося не толькі сфарміраваць органы дзяржаўнага кіравання, у тым ліку губернскі выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, але і падавіць апазіцыйныя сілы. Былі ліквідаваны Гарадская дума, земства, Гарадскі Савет салдацкіх і рабочых дэпутатаў, дзе мелі перавагу эсэры, меншавікі і бундаўцы. У пачатку студзеня 1918 г. горад быў пераведзены на асаднае становішча, былі падаўлены стыхійныя выступленні, звязаныя з адкрыццём у Петраградзе Устаноўчага сходу.

Аднак з пачаткам і хуткім наступленнем нямецкіх войскаў па ўсяму фронту, немагчымасцю аказаць арганізаванае супраціўленне, эвакуацыяй органаў Аблвыканкамзаху ў Смаленск становішча бальшавікоў стала хісткім. У сувязі з гэтым паўстала пытанне аб эвакуацыі і Віцбскіх органаў Савецкай улады. У той жа час іх палітычныя праціўнікі абмяркоўвалі пытанне аб змене ўлады ў Віцебску. Так, 22 і 23 лютага 1918 г. адбыліся пасяджэнні камітэта аб'яднанай РСДРП з удзелам меншавікоў і бундаўцаў, дзе ў мэтах захавання ў горадзе парадку, прадухілення "авантурыстычных" выступленняў беларусаў прапаноўвалася стварыць Часовы камітэт, а ў далейшым перадаць уладу Гарадской думе [3, арк. 27–27 адв.]. У абвешчаных палітычных заявах меншавікоў і бундаўцаў праяўлялася жаданне аднавіць Устаноўчы сход, спыніць грамадзянскую вайну і, адначасова, гэта была рэакцыя на абвешчаную ў Мінску 21 лютага 1918 г. 1-ю Устаўную грамату Выканкама Рады Усебеларускага з'езду, якой той абвясціў сябе часовай уладай на Беларусі.

Заключэнне Брэсцкага міру, з аднаго боку, умацавала становішча бальшавікоў у г. Віцебску, з другога, абвастрыла палітычную барацьбу паміж былымі саюзнікамі, бальшавікамі і левымі эсэрамі. Найбольш востра гэтае пытанне паўстала на ІІ-м Віцебскім губернскім з'ездзе Саветаў сялянскіх, рабочых, чырвонаармейскіх і батрацкіх дэпутатаў, які праходзіў з 10 па 14 мая і з 6 па 10 чэрвеня 1918 г. у г. Віцебску. Пры абмеркаванні бягучага моманту фракцыя левых эсэраў выступіла з праектам рэзалюцыі, у якой было заяўлена, што рэвалюцыя

знаходзіцца ў крызісе ў сувязі з заключэннем Савецкім урадам Брэсцкага міру. Левыя эсэры заклікалі да вяртання курса на сусветную сацыялістычную рэвалюцыю. Вынікі галасавання па рэзалюцыі аб бягучым моманце былі прадвызначаны складам з'езду, бо са 130 дэлегатаў, 73 былі бальшавікамі, а 22 левымі эсэрамі. Таму рэзалюцыя бальшавікоў, дзе прызнавалася неабходным заключэння Брэсцкага міру і разгортванне барацьбы з сусветнай буржуазіяй, была прынята з'ездам [2].

Лагічным развіццём палітычнага процістаяння бальшавікоў і эсэраў стаў так званы "леваэсэраўскі мяцеж" 6–7 ліпеня 1918 г. у Маскве. Яго праявы, як сцвярджае традыцыйная гістарыяграфія, былі і на тэрыторыі Беларусі: гэта леваэсэраўскія выступленні ў Оршы і Сянно ў першай палове жніўня 1918 г. Так, у матэрыялах органаў Савецкай улады па барацьбе з контррэвалюцыяй маецца тэлеграма з Сянно ад 14 жніўня 1918 г., дзе паведамляецца, што лідары Сенненскай арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, падтрымліваючы палітыку свайго ЦК, у ноч на 11 жніўня 1918 г. павялі 2-гі Смаленскі полк у наступленне на немцаў [1, арк. 424]. Усе гэтыя дзеянні, як на лініі размежавання войскаў Чырвонай Арміі і нямецкіх войскаў, так і ў Маскве, забойства германскага пасла, павінны былі, на думку эсэраў, сарваць Брэсцкі мір і рэалізаваць іх ідэю барацьбы за сусветную рэвалюцыю.

Прадметам вострай палітычнай барацьбы і ідэалагічнай прапаганды ў Віцебску 1918 г. стала яшчэ адна праблема, праблема беларускай дзяржаўнасці. У адказ на абвяшчэнне ў Мінску, на акупіраванай немцамі тэрыторыі Беларусі, Беларускай Народнай Рэспублікі вясной 1918 г., палітычныя праціўнікі і адкрытыя ворагі (бальшавікі, меншавікі, эсэры, бундаўцы) фактычна выступілі адзіным фронтам супраць беларускай дзяржаўнасці. Віцебскія меншавікі і бундаўцы на пасяджэннях аб'яднанага камітэта партыі не раз заяўлялі аб неабходнасці прыняць меры каб папярэдзіць авантурыстычныя выступленні беларусаў, бальшавікі на II-м губернскім з'ездзе Саветаў забяспечылі аднагалоснае прыняцце рэзалюцыі ў якой асудзілі абвяшчэнне незалежнай Беларускай Рэспублікі і арганізавалі сродкамі Віцебскай губернскай Надзвычайнай Камісіі праследаванне ўсіх, хто быў хоць нейкім чынам звязаны з беларускім нацыянальным рухам. Дапамогу ў гэтым праследаванні актыўных удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху і ажыццяўленні прапаганды і агітацыі супраць БНР аказваў сакратар Віцебскага аддзялення Беларускага нацыянальнага камісарыяту, левы эсэр А.І. Марціноўскі.

Харчовае пытанне ў 1918 г. стала адным з галоўных. Голад пагражаў і Віцебскай губерні. З Веліжу, Гарадка, Оршы прыходзілі звесткі аб адсутнасці запасаў харчавання. 13 мая 1918 г. УЦВК і СНК РСФСР выдалі дэкрэт «Аб харчовай дыктатуры», які даваў права на надзвычайныя меры пры рэквізіцыі лішкаў хлеба і барацьбу з кулацтвам.Першыя сялянскія выступленні ў Віцебскай губерні адбыліся вясной–летам 1918 года, калі пачаўся перадзел зямлі, рэквізіцыя хлеба (ДабрамысльАршанскага павета, Курына, Веляшковічы Віцебскага павета, Руднянская, Старынская воласці Гарадоцкага павета). Ужо ў ліпені 1918 г. пачалася ўзброеная барацьба супраць Савецкай улады. 7 ліпеня праціўнікі бальшавіцкіх Саветаў захапілі Янавічы, разграмілі рэўком, арыштавалі яго старшыню. Толькі з прыбыццём атраду чэкістаў з Віцебска ўдалося падавіць мяцеж.У лістападзе 1918 г. адбылося масавае сялянскае паўстанне, выкліканае харчраскладкай і мабілізацыяй у Чырвоную Армію, якое ахапіла амаль усю Віцебскую губерню. Цэнтрам паўстання стаў Веліжскі павет.

**Заключэнне.** Такім чынам Віцебск у 1918 г. не стаяў у баку ад вострых палітычных падзей, наадварот тут адлюстраваліся практычна ўсе тагачасныя значныя грамадска-палітычныя праблемы краіны.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1821. Воп. 1. Спр. 7.
2. Постановления и резолюции 2-го Витебского губернского съезда Советов Крестьянских, Рабочих, Красноармейских и Батрацких Депутатов, состоявшегося в г. Витебске с 10 по 14 мая и с 6 по 10 июня 1918 г. – Витебск, 1918. [Брошюра] // ВОКМ. – КП 16255/24.
3. Расійскі цэнтр захавання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі. – Ф. 451. Воп. 2. Спр. 37.



Репозиторий ВГУ